# Пад знакам большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі

Падрыхтоўка да правядзення справаздачна-выбарчых сходаў, іх правядзенне ў пярвічных комсамольскіх арганізацыях обласці азнаменавалася палітычным і вытворчым уздымам комсамольцаў і моладзі. У комсамол уступае лепшая моладзь, апраўдаўшая сябе на практычнай рабоце. Чэрвеньскім райкомам комсамола прынят у члены ВЛКСМ брыгадзір калгаса «Новая пабудова» тав. К. Матусевіч, брыгада якога з'яўляецца лепшай у калгасе. Прынят у комсамол трактарыст Плешчаніцкай МТС тав. Бурылёнак. За студзень месяц па обласці створана 104 новых пярвічных комсамольскіх арганізацый, з іх 44 калгасных і 13—у машынатрактарных станцыях.

У час падрыхтоўкі і правядзення справаздачна-выбарчых сходаў комсамольцы і моладзь прарабілі вялікую работу па збору сродкаў у дапамогу дзецям-сіротам і дзецям франтавікоў. Патрыятычны пачын комсамольцаў даў добрыя вынікі. За 15 дзён студзеня моладзь обласці перадала дзіцячым дамам 7.800 кілограмаў збожжа, 17.200 кілограмаў бульбы, 950 кілограмаў гароднiны 1.200 комплектаў дзіцячага адзення і пасцельных прылад. Калгасная моладзь Чэрвеньскага Заслаўскага, Плешчаніцкага раёнаў падрыхтоўвае для дзяцей абозы з харчаваннем.

Комсамольская арганізацыя калгаса «Камінтэрн», Рубілкаўскага сельсовета, Дзяржынскага раёна, якая вырасла з 10 чалавек да 40, паспяхова спраўляецца са сваімі задачамі. Моладзь сабрала на танкавую калону «Беларускі комсамолец» 8 тысяч рублёў, для дзіцячых дамоў—15 пудоў збожжа. У калгасе створана тры звяны высокага ўраджаю, які дзейна рыхтуюцца да веснавой сяўбы. Сіламі моладзі для чыгуначнай станцыі Койданава нарыхтавана 30 кубаметраў дроў, з якіх 15 ужо вывезена. Адначасова з рашэннем гаспадарчых задач комсамольцы павышаюць свой ідэйна-палітычны ўзровень, сістэматычна працуюць над сабой.

Справаздачна-выбарчыя сходы ў пярвічных комсамольскіх арга

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы